# [11 лютага 2025 года Міністэрства сувязі і інфарматызацыі Рэспублікі Беларусь выпускае ў абарачэнне чатыры паштовыя маркі з серыі «Драпежныя расліны».](https://xn--b1akbcqh2a7i.xn--90ais/11-lyutaga-2025-goda-ministerstva-suvyazi-i-infarmatyzacyi-respubliki-belarus-vypuskae-u)

Друкаваліся таксама ў малым лісце.

Мастак А. Міцянін. Дызайн М. Крэзо.

Аддрукаваны ў ДП «Выдавецтва «Беларускі Дом друку».

Драпежныя расліны (называюць таксама насякомаеднымі) здольны лавіць і ператраўляць дробных жывёл, пераважна насякомых, з целаў якіх яны атрымліваюць азот і фосфар (дадатковая крыніца сілкавання), што дае гэтым раслінам магчымасць расці там, дзе мала такіх элементаў.
Кветкавых раслін (а драпежнікі сустракаюцца толькі сярод іх) каля 300 000 відаў, з іх звыш 600 відаў – драпежнікі. У Беларусі ў дзікай прыродзе расце 10 відаў драпежных раслін.
На марках прадстаўлены: тлушчанка звычайная, расіца круглалістая, плывунец звычайны, альдраванда пухіраватая.

У дзень выпуску паштовых марак у абарачэнне на паштамце Мінска будзе праводзіцца спецыяльнае гашэнне на канверце «Першы дзень».

Малюнак




**Source URL:**
*https://xn--b1akbcqh2a7i.xn--90ais/11-lyutaga-2025-goda-ministerstva-suvyazi-i-infarmatyzacyi-respubliki-belarus-vypuskae-u*